WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

5 ЛІСТАПАДА 2009 г. ЧАЦВЕР № 210 (26568)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.



Фота БЕЛТА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «БІЗНЭС-СУПОЛЬНАСЦІ БЕЛАРУСІ І ГЕРМАНІІ ПАВІННЫ МАКСІМАЛЬНА АБ'ЯДНАЦЬ НАМАГАННІ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прапанаваў стварыць няўрадавы беларуска-германскі Савет дзелавога супрацоўніцтва. Аб гэтым ён заявіў 4 лістапада на сустрэчы з дэлегацыяй дзелавых колаў Германіі, якая прыбыла ў Мінск на чале са старшынёй Усходняга камітэта германскай эканомікі Клаўсам Мангольдам.

Беларускі лідар лічыць, што ў Беларусі ёсць шмат галін, куды могуць прыйсці германскія інвестары. «Перш за ўсё гэта тыя сферы, у якіх вы з'яўляецеся прызнанымі лідарамі: аўтамабільнае і сельскагаспадарчае машынабудаванне, хімічная і нафтахімічная галіны, энергетыка, высокія тэхналогіі», — сказаў Прэзідэнт.

«Думаю, што нашым германскім сябрам час сур'ёзна задумацца аб адкрыцці свайго банка ў Беларусі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што ў нашай краіне створаны спрыяльныя ўмовы для прыцягнення капіталаў у прыватызацыю дзяржаўнай уласнасці, развіццё малых і сярэдніх гарадоў, свабодных эканамічных зон.

Прэзідэнт адзначыў асаблівую ролю Усходняга камітэта ў развіцці эканамічнага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі. Цяперашняя дынаміка беларуска-еўрапейскага дыялога адкрывае перад Беларуссю і Германіяй новыя магчымасці для ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў самых розных галінах. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што «візіт такой прадстаўнічай дэлегацыі флагманаў германскага бізнэсу з'яўляецца самым наглядным сведчаннем гатоўнасці Германіі да маштабнага пашырэння эканамічных адносінаў з Беларуссю».

«Самае галоўнае, — падкрэсліў Прэзідэнт, — каб тыя бізнэсмены, якія гатовы прыйсці ў Беларусь са сваімі ідэямі і праектамі, бачылі ў нас раўнапраўных партнёраў, каб у аснове адносінаў ляжалі сумленнасць і прыстойнасць».

Аляксандр Лукашэнка перасцярог еўрапейскі бізнэс ад памылковага стэрэатыпа, згодна з якім у Беларусі быццам бы няма выйсця, і яна згодзіцца на любыя варыянты прыватызацыі ўласнасці, што прапануюцца Захадам. «Той, хто так думае — вельмі памыляецца. Не трэба думаць, што Беларусь пойдзе на прыватызацыю сваёй уласнасці за бясцэнак», — сказаў Прэзідэнт. «Прыходзьце да нас і працуйце так, як вы працуеце на нямецкай зямлі. І тады ў нас усё атрымаецца, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Вы павінны бачыць у беларусах самых добрых сяброў. Беларуская зямля для вас павінна стаць такой жа роднай, як нямецкая».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, гэты год, нягледзячы на сусветны фінансава-эканамічны крызіс, адзначаны прыкметнай актывізацыяй беларуска-германскага ўзаемадзеяння ў сферы эканомікі.

Закранаючы тэму дыялога Беларусь — ЕС, Прэзідэнт канстатаваў, што кіраўніцтва Еўрасаюза і ўрады еўрапейскіх краін пачалі ўсведамляць значнасць Беларусі як паўнапраўнага партнёра. «Са свайго боку, не ставячы перад сабой задачу стаць кандыдатам на ўступленне ў ЕС, Беларусь рэальна дэманструе зацікаўленасць у развіцці ўзаемадзеяння з Еўрасаюзам», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падзякаваў прадстаўнікам Усходняга камітэта германскай эканомікі за вялікі ўклад у станаўленне адносінаў Беларусі з Еўрасаюзам. «Вы — нашы прыхільнікі», — адзначыў ён. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў сваім дыялогу з Бруселем Мінск «не зыходзіць з таго, што Беларусі няма куды дзявацца, і мы, прагінаючыся, папаўзём у Еўрасаюз». «Гэта зусім не так. Мы зыходзім з прагматычных пазіцый. Мы з Еўрасаюзам сёння гандлюем не менш, чым з Расіяй. А любы эканамічны працэс павінен быць забяспечаны працэсам палітычным і дыпламатычным». «Акрамя таго, Беларусь — геаграфічны цэнтр Еўропы. І мы ніколі не стваралі і не ствараем праблем для еўрапейскага кантынента. Больш таго, мы нясём вялікую нагрузку па забеспячэнні яго бяспекі (у плане барацьбы з распаўсюджваннем ядзерных матэрыялаў, нелегальнай міграцыі, тэрарызму і гэтак далей)», — дадаў ён.

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што Беларусь будзе ўдзячна германскаму боку за кансультацыі і дапамогу ў пытаннях, звязаных з уступленнем нашай краіны ў СГА. Аднак перш чым інтэгравацца ў гэту арганізацыю, Беларусі хацелася б вырашыць з Еўрасаюзам пытанні аб лібералізацыі мытных пошлін на беларускія тавары.

У сваю чаргу Клаўс Мангольд выказаў поўную падтрымку ініцыятыве Прэзідэнта па стварэнні Савета дзелавога супрацоўніцтва. «Думаю, такая група змагла б паспяхова дапоўніць кантакты на ўрадавым узроўні», — адзначыў госць. Бізнэсмен падкрэсліў, што ў дзелавым супрацоўніцтве Беларусі і Германіі не можа быць «лішніх» тэм. «Германія цяпер як ніколі зацікаўлена ў развіцці добрых адносінаў з Беларуссю, — падкрэсліў кіраўнік дэлегацыі. — Сёння размова ідзе аб тым, каб пераўтварыць гэту фундаментальную цікавасць ва ўзаемавыгадныя праекты». І Беларусь, і Германія зацікаўлены ў скарачэнні спажывання нафты і прыроднага газу. У сувязі з гэтым вялікае значэнне маюць перспектывы беларуска-германскага ўзаемадзеяння ў развіцці альтэрнатыўнай энергетыкі. «У выпадку паспяховага супрацоўніцтва ў гэтай сферы, мы маглі б дабіцца эканоміі энергетычных расходаў на 30—40 працэнтаў», — лічыць Клаўс Мангольд. Яшчэ адным ключавым напрамкам узаемадзеяння з'яўляецца развіццё малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, дадаў ён. Акрамя таго, германскі бок зацікаўлены ў тым, каб адыграць пэўную ролю ў працэсе прыватызацыі беларускіх прадпрыемстваў, улічваючы станоўчы вопыт Германіі ў 1990-х гадах у гэтай сферы. Клаўс Мангольд адзначыў, што Беларусь ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу мае значна лепшыя паказчыкі эканамічнага развіцця ў параўнанні з іншымі краінамі.

На заканчэнне сустрэчы бакі дамовіліся аб тым, што ў найбліжэйшы час будуць прапрацаваны канкрэтныя праекты. Аб выніках будзе далажана Прэзідэнту ў канцы першага квартала 2010 года.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## МАРЫЯ З МАНГОЛІІ

**«Раней тут было 14 хат, — кажа Марыя Аляксееўна ЗАРУБІЦКАЯ — адзіная жыхарка адзінай у Беларусі вёскі з афіцыйнай назвай Манголія (Сенненскі раён). — Не ведаю нават, як давядзецца жыць сёлета». Пенсіянерку і ўдаву хвалююць не столькі назва вёскі з яе паходжаннем, мінулым і тым больш будучым, колькі адольваюць надыходзячыя клопаты — як перазімаваць у пустой вёсцы. Нядаўна апошняя суседка з'ехала.**

Марыя Аляксееўна нарадзілася ў суседняй Абідаўцы (цяпер Атраднае), у 1960 годзе выйшла замуж за Івана і засталася з ім у Манголіі. Нарадзіла двое дзяцей, працавала «на пахадзішчых», гэта значыць паляводам. Адкуль у населенага пункта гэтае дзіўнае імя, яна не ведае, але ўпэўнена сцвярджае, што на яе памяці ніякія мангольцы ў вёсцы не жылі. «Мы такія самыя беларусы, як і ўсё навокал, — кажа Марыя і згадвае адзін забаўны выпадак. — Ляжала неяк у бальніцы, суседка па ложку запыталася, адкуль я прыехала, адказваю абсалютна спакойна, што з Манголіі. У той аж здзіўлення амаль мову адняло, толькі і спытала: «А як вы ў Беларусь патрапілі?»

Шкада, што век у Манголіі зусім кароткі — пакуль жыве ў ёй Марыя.

«Як вы думаеце, ці дадуць мне кватэру ў Сянно, калі пайду да старшыні райвыканкама? — запытала на ўсялякі выпадак Марыя Аляксееўна. — Хіба можна аднаму ў вёсцы заставацца?».

## МІНСК — НА ПАРОЗЕ ЭПІДЭМІІ

**Статыстыка колькасці захварэлых у беларускай сталіцы на грып і вострыя рэспіраторныя інфекцыі дазваляе меркаваць, што літаральна днямі ў Мінску могуць афіцыйна абвясціць аб пачатку эпідэміі. У панядзелак у медыцынскія ўстановы сталіцы з сімптомамі прастуды звярнуліся 14 333 чалавекі, а ў аўторак — 12 980 чалавек. На мінулым тыдні па медыцынскую дапамогу звярталіся 5-7 тысяч чалавек за дзень, і гэтыя лічбы тлумачыліся сезонным уздымам захваральнасці.**

Зразумела, што панядзелак — традыцыйна самы напружаны дзень для паліклінічных устаноў, таму паказчыкі іншых дзён працоўнага тыдня звычайна бываюць больш «сціплыя». Але амаль 13 тысяч звароту за аўторак пры зачыненых на канікулы школах — гэта вельмі высокі паказчык. У стацыянарах 3 лістапада было шпіталізавана 153 чалавекі, з іх 66 немаўлят ва ўзросце да 2 гадоў і 32 дзіцяці ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў. Аднак доля дарослых пацыентаў сярод захварэлых на прастуду апошнім часам павялічвалася: з 13 тысяч хворых 7619 чалавек — ва ўзросце ад 18 гадоў і старэйшыя. Да таго ж менавіта ў дарослых часцей за ўсё і дыягнастуецца грып. Усяго за 3 лістапада дыягназ «грып» быў пастаўлены ў 3028 выпадках. Дарослым пацыентам такі дыягназ ставіўся 2053 разы. У Віцебску 2 лістапада эпідэмічны парог захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі быў перавышаны ў 6 разоў. Перавышэнне парога захваральнасці ў некалькі разоў назіралася таксама і ў іншых кантрольных гарадах Віцебшчыны: Полацку, Наваполацку і Оршы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## У БЕЛАРУСІ НЯМА ЎСПЫШКІ ЗАХВОРВАННЯЎ НА ПНЕЎМАНІЮ

**У Беларусі пачаўся сезонны ўздым захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі (грып А, ВРВІ і г.д.). Як і ў суседніх краінах (Расія, Украіна), у Беларусі сёлета хворых амаль на 70 % больш, чым у мінулым годзе. Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве аховы здароўя Беларусі.**

Адначасова ў краіне, як гэта звычайна бывае ў восеньскі перыяд, расце колькасць захворванняў на пнеўманію, адзначылі ў Мінздраве. Агульная колькасць хворых на пнеўманію — 2154 чалавекі. Лятальных вынікаў за апошнія два тыдні — 19 (менш за 1 %). За гэты ж перыяд мінулага года ад пнеўманіі памёр 21 чалавек. «Таму няма ніякіх падстаў сцвярджаць, што ў краіне, быццам, назіраецца ўспышка захворванняў на пнеўманію», — падкрэслілі ў міністэрстве.

Толькі ў 7 з 19 пацыентаў, якія памерлі ад пнеўманіі, выяўлены вірус A/H1N1. Усе яны або прыехалі з-за мяжы, або блізка кантактавалі з тымі, хто толькі што вярнуўся ў Беларусь. У цэлым па рэспубліцы выяўлена 85 выпадкаў свінога грыпу, 31 чалавек знаходзіцца ў бальніцах, 47 чалавек ужо паправіліся.

У Мінаховы здароўя адзначылі, што грып A/H1N1 пры своечасовым звароце да ўрача цалкам вылечваецца, што пацвярджаецца агульнасусветнай практыкай. Бальніцы краіны цалкам забяспечаны неабходнымі лекамі для лячэння ўсіх, хто звярнуўся.

Адначасова прыняты шэраг мераў па дадатковым забеспячэнні аптэк краіны супрацьвіруснымі прэпаратамі. На працягу месяца ў аптэчную сетку паступіць больш за мільён упаковак такіх прэпаратаў, як «Арпетол», «Рэмантадзін», «Арбідол», «Таміфлю».

Міністэрства аховы здароўя Беларусі будзе пастаянна і аператыўна інфармаваць аб развіцці сітуацыі.

**Кар. БЕЛТА.**

## А ПАРЭЧКІ — ДЭФІЦЫТ

**НЯГЛЕДЗЯЧЫ на заканчэнне сезона масавых нарыхтовак спажывецкая кааперацыя працягне закупкі лішкаў сельгаспрадукцыі — у прыватнасці, гаворка ідзе аб бульбе, капусце, позніх таматах, журавінах і таварных яблыках.**

Паводле слоў начальніка ўпраўлення нарыхтовак Белкаапсаюза Уладзіміра Гапановіча, сёлета ўдалося значна павялічыць закупкі агуркоў, памідораў, капусты, садовых суніц, парэчак, вішні, слівы, алычы, чарніц, а таксама, нягледзячы на малы ўраджай, практычна захаваць паказчыкі па яблыках. Пры гэтым чакаецца, што па выніках года кааператары ў цэлым выплацяць вяскоўцам за здадзеную прадукцыю каля 220 млрд рублёў. Летась агульная сума склала 194 мільярды.

Нягледзячы на сусветны крызіс, удалося захаваць экспарт і пры гэтым пашырыць яго геаграфію — сёлета ўпершыню наша краіна паставіла 100 тон чарніц у Кітай. Другі цікавы момант — закупачныя цэны. У выніку кепскага ўраджаю яны прыкметна павялічыліся па бульбе, прычым, каб зімой-вясной не ўзнікла дэфіцыту той жа бульбы ў крамах, аб'ёмы яе закладкі на захоўванне вырашана павялічыць.

Але закупачныя цэны павышаліся не заўсёды. У сувязі з іх рэзкім зніжэннем на знешніх рынках сёлета спажывецкая кааперацыя была вымушаная амаль у паўтара раза знізіць кошты на чарніцы. Падобны малюнак назіраецца і па журавінах: калі летась за іх кілаграм у свеце давалі 1,6, то сёлета — усяго 0,88 еўра. Закупачныя цэны ўнутры Беларусі адрэагавалі адпаведна. «Гэта ў прыватнасці трэба памятаць тым, хто сабраў журавіны, але мае намер «прытрымаць» іх да лепшых часоў, — заўважыў Уладзімір Гапановіч. — На жаль, нават пры ўсім жаданні павялічыць закупачныя цэны тут немагчыма».

Каб разлічваць на вартыя даходы, уладальнікам прыватных гаспадарак ёсць сэнс звярнуць увагу на новыя напрамкі — скажам, у краіне рэальна адчуваецца дэфіцыт чорных парэчак, а таксама прыдатных для кансервавання агуркоў адкрытага грунту.

**Сяргей ГРЫБ.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ЗІМА ЧАКАЕЦЦА ХАЛАДНЕЙШАЙ ЗА МІНУЛУЮ

Пра гэта расказала **галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга ФЯДОТАВА**. Праўда, марозныя дні ўсё ж будуць змяняцца адлігамі. Гэта характэрна для беларускай зімы, удакладніла сіноптык. У цэлым жа зімовы тэмпературны рэжым чакаецца блізкім да сярэдняга шматгадовага значэння. Сярэднямесячная тэмпература будзе вагацца ад мінус 2 да мінус 8 градусаў.

**Святлана ФРАЛЯНКОВА,** *«Мінск—Навіны».*

### АФРЫКАНСКАЯ ЧУМА «НАКЛАЛА» АБМЕЖАВАННІ НА ІМПАРТ СВІНІНЫ З РАСІІ

**Беларусь увяла часовыя абмежаванні на ўвоз з усёй тэрыторыі Расіі свініны, прадуктаў яе перапрацоўкі, а таксама свіной тэхнічнай сыравіны.**

Такое рашэнне прынятае ў сувязі з пагаршэннем эпізаатычнай сітуацыі па афрыканскай чуме свіней у Расійскай Федэрацыі. Часовыя абмежаванні на ўвоз на тэрыторыю краіны памянёных свініны, прадуктаў яе перапрацоўкі, свіной тэхнічнай сыравіны ўведзены з 4 лістапада. На які тэрмін? Як зазначыла прэс-сакратар Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Дар'я Казлоўская, у дачыненні да Расіі нейкія часовыя межы пакуль не вызначаны.

Увогуле ж, калі гаварыць пра афрыканскую чуму, дык для людзей гэтая хвароба не з'яўляецца небяспечнай. Чаго не скажаш пра свіней. Звычайна абмежаванні на імпарт прадукцыі з краіны, дзе была выяўлена афрыканская чума, уводзяцца тэрмінам на тры гады. Адначасова з уводам часовых абмежаванняў адменены раней выдадзеныя дазволы на ўвоз на тэрыторыю Беларусі з Расійскай Федэрацыі вышэйназваных прадуктаў жывёльнага паходжання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### БОНІ І КЛАЙД ПА-КРУГЛЯНСКУ

**Разбойная пара ўначы напала на старых і адабрала 300 тысяч рублёў.**

У Круглым 3 лістапада а 2-й гадзіне ўначы невядомыя зламыснікі разбілі шкло ў акне прыватнага дома на вуліцы Перамогі. Гаспадар дома, якому 96 гадоў, і яго пажылая жонка моцна спужаліся. Рабаўнікі адштурхнулі бабулю, пагражалі нажом і патрабавалі грошы ў дзеда. Каб яны пакінулі іх жывымі і ў спакоі, старыя аддалі невядомым 300 тысяч рублёў. У старых гаспадароў слабы зрок, і ад перапуду яны, бездапаможныя, не здолелі нават набраць тэлефон міліцыі. Пра здарэнне расказалі толькі раніцай сацыяльнаму работніку, які прыйшоў на дапамогу і выклікаў міліцыянераў.

Па гарачых слядах разбойнікаў знайшлі хутка. Высветлілася, што ўварваліся ў дом старых два чалавекі: 32-гадовая жанчына — жыхарка вёскі Дудаковічы Круглянскага раёна, якая раней была асуджана за няплату аліментаў, і 21-гадовы круглянец, у біяграфіі якога ўжо ёсць пакаранне за хуліганства. Мужчына і жанчына могуць атрымаць ад 6 да 15 гадоў пазбаўлення волі на кожнага.

**Алена КАЗЛОВА.**

### ВЫБУХ У КАЦЕЛЬНІ

**У кацельні «Баранавіцкага райаграсэрвіса», які знаходзіцца ў в. Арабаўшчына, адбыўся выбух.**

Вартаўнік наліў халодную ваду ў кацёл, які ўжо быў моцна разагрэтым. Вада імгненна ператварылася ў пару, і кацёл узарваўся.

Вартаўніка праз дзверы выкінула на вуліцу, а яго знаёмы, які выпадкова зайшоў у кацельню, трапіў у бальніцу з чэрапна-мазгавой траўмай. Абышлося.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

## «Літаральна днямі будзе арганізаваны збор і пастаўка малака ад прыватнікаў з Капыльскага раёна на заводы ў Нясвіж і Узду»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**З вёскі Камсамольскае Капыльскага раёна паступіла калектыўная скарга ад малаказдатчыкаў: на момант звароту ад насельніцтва чацвёрты дзень не прымалі малако, паколькі яго адмаўляецца браць мясцовы масласырзавод.**

— Толькі ў нашай вёсцы недзе каля 50 кароў, больш за іх гаспадароў здаюць малако. Калі пакінуць для ўласных патрэбаў нейкі літраў, дык з таго ўсё адно застаецца штодня яшчэ літраў 13—14. Куды іх падзець? Асабіста я ў гэтыя дні выліваю іх свінням, — ад імя «ініцыятыўнай групы» распавяла нам адна з гаспадынь. — Гавораць, што наша малако быццам бы павінны браць або Нясвіжскі, або Уздзенскі заводы, аднак пакуль яго збор ніхто не арганізаваў...

Як няцяжка было здагадацца, праблема тут звязана з якасцю малака ад насельніцтва, у прыватнасці, наяўнасцю ў ім антыбіётыкаў, а таксама жорсткімі ў апошні час патрабаваннямі да якасці сыравіны з боку расійскага Расельгаснагляда. Што і пацвердзіла нам у тэлефоннай гутарцы **начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Капыльскага райвыканкама Ірына КІСЛЯК.**

— Згодна з іх тэхнічнымі рэгламентамі, малако ад насельніцтва не можа ісці на перапрацоўку, таму яго прыём ад прыватных малаказдатчыкаў і быў прыпынены. Сутнасць у тым, што большая частка прадукцыі нашага Капыльскага масласырзавода ідзе на экспарт. Каб перапрацоўваць малако ад насельніцтва, трэба мець асобную лінію, а на гэтым прадпрыемстве яе няма, — патлумачыла Ірына Мікалаеўна. —Такія лініі ёсць на заводах у Нясвіжы і Уздзе. Малако ад насельніцтва дазваляецца перапрацоўваць для ўнутранага спажывання, паколькі адпаведныя патрабаванні да якасці сыравіны ў згаданым кантэксце тут значна больш мяккія. І гэтыя прадпрыемствы гатовыя прымаць малако ад прыватных малаказдатчыкаў з нашага раёна, больш за тое, надоечы адна машына ўжо пайшла ў Нясвіж. Літаральна днямі будзе вырашана пытанне аб такіх рэгулярных пастаўках.

Аднак, паводле наступных слоў суразмоўцы, тут павінна быць вырашана адно пытанне, што датычыцца цаны за прынятае малако. Ад насельніцтва, як вядома, яго прымаюць па расцэнках, крыху большых, чым ад гаспадарак (прынамсі, цана павінна быць не ніжэйшая за кошт малака першага гатунку). Таму трэба вырашаць пытанне, на каго ляжа гэтая розніца. Афармленнем дакументаў і выклікана пэўная замінка. Верагодна, розніцу будзе выплачваць або адно прадпрыемства, або другое.

Што датычыцца канкрэтна сітуацыі ў вёсцы Камсамольскае. Як распавяла далей Ірына Кісляк, тут малаказдатчыкі здаюць 300 літраў раз у два дні. Некалькі дзён малако ад насельніцтва сапраўды не прымалі. Літаральна ў дзень размовы журналіста «Звязды» з начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама мясцовае сельскагаспадарчае прадпрыемства атрымала ўказанне: прымаць пакуль ад насельніцтва малако і накіроўваць яго на паенне цялят. А ўласную прадукцыю, якая такім чынам «вызвалілася», здаваць на завод на перапрацоўку. Людзі ў матэрыяльным сэнсе не павінны нічога страціць, паколькі малако ад іх павінны прымаць па тых жа цэнах, што былі знаёмыя малаказдатчыкам і дагэтуль. Сродкі будзе выдзяляць згаданая мясцовая гаспадарка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЦВК УКРАІНЫ ЗАРЭГІСТРАВАЛА КАНДЫДАТА СУПРАЦЬ УСІХ

**Цэнтральная выбарчая камісія Украіны 4 лістапада зарэгістравала кандыдатам у прэзідэнты краіны чалавека з прозвішчам Супраць усіх, паведамляе «Новы рэгіён».**




Навяўлены кандыдат пасля атрымання пасведчання кандыдата прадэманстраваў цікаўным пашпарт, дзе ў радку «прозвішча» напісана Супраць усіх.

Да нядаўняга часу яго клікалі Васіль Гумянюк, раней ён працаваў мэрам горада Ярэмча, а цяпер узначальвае Гандлёва-прамысловую палату Івана-Франкоўскай вобласці.

Паводле слоў самога Супраць усіх, на выбарах ён разлічвае на галасы тых людзей, хто расчараваўся ў цяперашняй палітычнай эліце Украіны. Члены ЦВК паставіліся да новага кандыдата з гумарам, аднак мусілі яго зарэгістраваць: усе дакументы Супраць усіх былі ў парадку. Грашовы заклад у суме 2,5 мільёна грыўняў ён таксама ўнёс. Між тым, у Кіеве ўжо з'явіліся рэкламныя плакаты, якія заклікаюць гараджан галасаваць супраць усіх. Паводле апытанняў грамадскай думкі, колькасць грамадзян Украіны, якія збіраюцца паступіць менавіта так, на выбарах 17 студзеня будзе рэкордна высокай.

### ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА МАЛДОВЫ ПРЫЗНАЧАНЫЯ НА 10 ЛІСТАПАДА

**Выбары новага малдаўскага прэзідэнта пройдуць у рэспубліцы 10 лістапада. Такое рашэнне прыняў парламент Малдовы.**

Як паведамлялася раней, прызначаныя на 23 кастрычніка выбары кіраўніка дзяржавы былі перанесеныя: у дэпутатаў узніклі рознагалоссі адносна правядзення выбараў з удзелам толькі аднаго кандыдата. У гэтай сітуацыі парламенцкая большасць у асобе Альянсу за еўрапейскую інтэграцыю прыняла рашэнне ўнесці папраўкі ў заканадаўства і перанесці выбары.

Паводле прынятых паправак, выбары прэзідэнта можна праводзіць і пры наяўнасці толькі аднаго кандыдата. У выпадку, калі ён не набярэ неабходныя 61 голас, на працягу пяці дзён праводзяцца паўторныя выбары, з вылучэннем новых або тых жа кандыдатур. У выпадку правалу паўторных выбараў прэзідэнт або выканаўца яго абавязкаў распускае парламент.

### КОШТ ЗОЛАТА ЎСТАНАВІЎ НОВЫ РЭКОРД

**Кошт золата вырас на працягу другой сесіі запар, абнавіўшы дасягнуты 3 лістапада гістарычны максімум, паведамляе AFP. На біржы ў Лондане каштоўны метал у 12:00 гандляваўся на адзнацы 1093,1 долара за тройскую ўнцыю, што на шэсць долараў вышэй за ўзровень папярэдняга дня.**

Рост кошту золата тлумачыцца інфармацыяй аб тым, што МВФ прадаў Індыі каля 200 тон металу. Фонд плануе прадаць больш за 400 тон са сваіх запасаў, прычым галоўным прэтэндэнтам на ўвесь гэты аб'ём раней называўся Кітай.

За апошні год цана на золата паднялася больш як на трэць.

### КОЛЬКАСЦЬ АХВЯРАЎ ГРЫПУ ВА УКРАІНЕ ВЫРАСЛА ДА 81

**Ва Украіне працягваецца эпідэмія грыпу і ВРВІ і колькасць ахвяраў хваробы расце. «Больш за 478 тысяч чалавек захварэлі, 81 чалавек памёр», — расказаў галоўны санітарны ўрач краіны Аляксандр Белавол.**



Пацверджаныя 14 выпадкаў грыпу A/H1N1, з іх тры — са смяротным зыходам. Нагадаем, эпідэмія грыпу ва Украіне была абвешчаная на мінулым тыдні.

### ЕЎРАКАМІСІЯ ЎЗЯЛА ПАД СУМНЕННЕ ЗДОЛЬНАСЦЬ ЭСТОНІІ ПЕРАЙСЦІ НА ЕЎРА

**Эстонія не зможа далучыцца да еўразоны ў 2011 годзе, калі не распачне захады для паніжэння дэфіцыту бюджэту да трох працэнтаў ВУП, як гэтага патрабуюць Маастрыхцкія пагадненні. Для таго, каб прывесці бюджэт у парадак, эстонскім уладам неабходна будзе знізіць выдаткі.**

Паводле ацэнак Еўракамісіі, у 2009 годзе дэфіцыт бюджэту Эстоніі не перавысіць трох працэнтаў ВУП. Тым не менш беспрацоўе, якое расце, і нізкае паступленне падатковых прыбыткаў могуць стаць прычынай росту дэфіцыту дзяржбюджэту краіны.

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «КОПЫЛЬСКИЙ МАСЛОСЫРЗАВОД» КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

ПРОВОДИТ ОЧЕРЕДНОЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже **имущества Столбцовского производственного участка ОАО «Копыльский маслосырзавод»,** расположенного по адресу: **г. Столбцы, ул. Свердлова, 3**, в составе зданий: производственное здание, об. пл. 2919,0 кв.м, производственно-вспомогательный цех, об. пл. 423,0 кв.м, здание котельной, об. пл. 261,5 кв.м, здание компрессорной, об. пл. 201,7 кв.м, здание прачечной, об.пл. 109,6 кв.м., автогараж, об. пл. 156,3 кв.м, здание моечной автомолцистерн, об. пл. 493,4 кв.м, здание ТП 27, об. пл. 60,8 кв.м, воздушная компрессорная, об. пл. 38,2 кв.м, сооружений: башня водонапорная, ограждение вокруг завода, передаточных механизмов: кабельные сети к силовому оборудованию, трасса газовая производственная 500 АЧ, сети связи воздушные, сети электроосвещения, сети канализационные, сети паропроводные, сети канализационные чугунные, а также оборудования и иного имущества согласно списку. **Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 1 700 119 485 бел. руб.** Под обслуживание объектов недвижимости сформировано два земельных участка об. пл. 0,7471 га; 0,0876 га. Задаток 100 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.07.09 г. Аукцион состоится **18.12.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.12.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «ДЗЕРЖИНСКИЙ ЭКСПЕРЕМЕНТАЛЬНО-МЕХАНИЧЕСКИИ ЗАВОД» (ПРОДАВЕЦ)
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ТЕХНИКИ:

| № лота | Наименование, год выпуска | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | МАЗ 54323, седельный тягач, 1993 г.в. | 14 728 000 (снижена на 20 %) |
| 2 | ГАЗ 66, топливозаправщик, 1980 г.в. | 2 625 600 (снижена на 20 %) |
| 3 | Автобус МАЗ 104С, 2001 г.в., (на 40 мест) | 84 340 800 (снижена на 10 %) |
| 4 | ЗИЛ-431410, 1989 г.в. | 6 440 790 (снижена на 20 %) |

Задаток 10 % от начальной цены лота. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.09.09; 30.07.09. Аукцион состоится **12.11.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.11.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.11.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 739,00 |
| 1 еўра | 4 043,04 |
| 1 латвійскі лат | 5 697,94 |
| 1 літоўскі літ | 1 171,31 |
| 1 чэшская крона | 154,34 |
| 1 польскі злоты | 946,41 |
| 1 расійскі рубель | 93,69 |
| 1 украінская грыўня | 330,00 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 29,2337 |
| UAH | 35,5641 |
| 1000 BYR | 10,6770 |
| EUR | 43,1606 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

Асаблівы рэжым

# АПТЭКІ БУДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ НАВАТ НОЧЧУ

**Міністэрства аховы здароўя выступіла з прапановай арганізаваць работу аптэк усіх формаў уласнасці па максімальна падоўжаным рэжыме працоўнага дня, без выхадных, і прадугледзець магчымасць работы аптэк у начны час.**

Як вынікае з ліста за подпісам міністра аховы здароўя Васіля Жарко, неабходнасць змянення графіку работы аптэк звязана з сезонным пад'ёмам захворвальнасці насельніцтва віруснымі інфекцыямі і ўзросшым патокам наведвальнікаў. Кіраўнікам аптэчных арганізацый усіх формаў уласнасці рэкамендуецца прыняць вычарпальныя меры па бесперабойнай наяўнасці ў аптэках сродкаў для прафілактыкі і лячэння рэспіраторных інфекцый: гарачкапаніжальных, болесуцяшальных, супрацьзапаленчых, імунамадулюючых і супрацьвірусных лекаў (арпетол, арбідолу, рэмантадзіну, таміфлю, ангрымакса, аксалінавай мазі, мазі «Бораментол»), антыбактэрыяльных лекавых сродкаў, масак для твару, медыцынскай марлі, медыцынскіх тэрмометраў.

У дакуменце звяртаецца ўвага на неабходнасць строгага выканання фармацэўтычнымі работнікамі аптэк інструкцый аб парадку інфармавання насельніцтва (у тым ліку і па тэлефоне) аб наяўнасці лекавых сродкаў, аб лекавых сродках, якія часова адсутнічаюць, і замене іх аналагамі.

У Мінску прынята рашэнне аб рабоце дзяржаўных аптэк да 16 лістапада без выхадных дзён.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# СВЯТАРЫ ЗАКЛІКАЮЦЬ НЕ ПАНІКАВАЦЬ З НАГОДЫ ЭПІДЭМІІ ГРЫПУ

**У МІНСКІМ праваслаўным прыходзе ў гонар іконы «Усіх тужлівых Радасць» распачынаецца спецыяльная набажэнствы «ў час гібельнай пошасці».**

Першае такое набажэнства — «Малебныя спевы ў час гібельнай пошасці і смяротнай заразы» ўжо было адслужана па просьбе прыхаджан 3 лістапада пасля Божай Літургіі а палове адзінаццатай раніцы ў Свята-Ефрасіннеўскай царкве. Гэты малебен традыцыйна служыцца ў Праваслаўнай Царкве падчас распаўсюджвання небяспечных хвароб, паведамляе Беларускі праваслаўны інфармацыйны партал www.sobor.by. Падчас малітоўных спеваў вернікі моляцца аб хуткім спыненні распаўсюджвання хваробы і папраўцы хворых.

— Мы адмянілі заняткі ў нашай нядзельнай школе і на тыдзень зачынілі майстэрні, дзе працуюць людзі з абмежаванымі магчымасцямі, — расказаў удзельнікам форуму на партале www.sobor.by настаяцель прыхода протаіерэй Ігар Карасцялёў, — Інваліды ўваходзяць у групу рызыкі, бо маюць аслаблены імунітэт. Панікаваць, вядома ж, не трэба, аднак паклапаціцца пра бяспеку варта.

З 1 лістапада спецыяльныя малітвы «падчас гібельнай пошасці» служацца і ва ўсіх праваслаўных храмах Украіны.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Погляд

# СВІНЫ ГРЫП ЯК ЛЮСТЭРКА, У ЯКІМ ВІДАЦЬ УСЁ



**Тысячы пастоў, якія тыражуюць чуткі і домыслы, «ананімы, якія заслугоўваюць даверу» ў бальніцах, парады «спрактыкаваных»... Гэта асноўныя «крыніцы», з якіх сёння інтэрнэт-карыстальнікі чэрпаюць «інфармацыю» пра свіны грып. Наўрад ці яны хоць колькі-небудзь праясняць няпростую сітуацыю або дапамогуць людзям. Наадварот. Толькі падальюць алею ў агонь...**

**Сёння для нас найбольшую каштоўнасць уяўляюць звесткі, якія сапраўды дапамогуць людзям засцерагчыся ад грыпу і адэкватна ацаніць тое, што адбываецца.**

**На наш погляд, запіс у блогу украінскага доктара Яўгена КАМАРОЎСКАГА «Свіны грып як люстэрка, у якім відаць усё...», зроблены ў ноч на 2 лістапада, падасца карысным для ўсіх: і для карыстальнікаў, якія паддаліся паніцы, і для тых, хто пакуль яшчэ не задумваўся аб сур'ёзнасці сітуацыі, а таксама для тых, каму сёння даводзіцца адказваць на шматлікія пытанні журналістаў і простых грамадзян.**

Прыводзім некаторыя фрагменты запісу.

«Дарагія мамы і таты! Людзі!!! Запомніце самае галоўнае: тактыка вашых дзеянняў зусім не залежыць ад таго, як называецца вірус. Гэта грып сезонны, свіны, сланавы, пандэмічны, гэта ўвогуле не грып — не важна. Важна толькі тое, што гэта вірус, што ён перадаецца паветрана-кропельным шляхам і што ён пашкоджвае органы дыхання. Адсюль і канкрэтныя дзеянні.

## ПРАФІЛАКТЫКА

Калі вы (ваша дзіця) сустрэнецеся з вірусам, а ў вас няма ў крыві ахоўных антыцелаў, вы захварэеце. Антыцелы з'явяцца ў адным з двух выпадкаў: або вы перахварэеце, або вы прышчэпіцеся.

Прышчапіцца можна толькі ад сезоннага грыпу. Ад свінога вакцыны пакуль няма (ва Украіне (у Беларусі таксама. — Tut.by)). Тым не менш, мець ахоўныя антыцелы да тых трох вірусаў, якія ўваходзяць у склад сезоннай вакцыны, лепш, чым не мець увогуле ніякіх.

**1. Ёсць магчымасць прышчапіцца** (прышчапіць дзіця) — **прышчапляйцеся,** але пры той умове, што, па-першае, вы здаровыя і, па-другое, для вакцынацыі не трэба будзе сядзець у саплівым натоўпе ў паліклініцы. Апошняе робіць вашы шанцы на адэкватную вакцынацыю празрыстымі.

